**Мацieўскі, М.** У горных цяснінах / М. Мацieўскі // Наша Талачыншчына. – 2005. – 28 верас. – С. 2.

# У ГОРНЫХ ЦЯСНІНАХ



Для Алега Кітаёва няма больш любых сэрцу мясцін, чым роднае звяняцкае наваколле. Ён любіць сустракаць світанкі ў полі, слухаць срэбраны званочак жаўранка, шэпт спеючых каласоў на хлебнай ніве.

– Мог бы і я паехаць у горад, – прызнаецца Алег, – уладкавацца на любое прадпрыемства, бо маю рэдкую спецыяльнасць слесара па рамонце складанай аутаматыкі, але не. Не па душы мне гарадскія лабірынты, распалены пад сонцам асфальт, мітусня. Цесна мне там. А ў нас – раздолле, дыхаецца легка, усё мне тут знаёмае да драбніц, сэрцу мілае...

І ўсё ж Алегу Кітаёву давялося на два гады развітацца з роднымі мясцінамі. Прызвалі маладога слесара тадышняга калгаса імя XX з езда КПСС на службу ў рады Савецкай Арміі. Спачатку трапіў ва Узбекістан, прайшоў вучэбку, авалодаў спецыяльнасцямі мінамётчыка, гранатамётчыка і аўтаматчыка. А потым салдацкія дарогі прывялі яго ў Афганістан. Стаў Кітаёу байцом асобага батальёна разведкі. А ў разведчыкаў, вядома ж, спакойнай службы не бывае. Уключыўся ў яе і наш зямляк.

...Напярэдадні душманы абстралялі размяшчэнне афганскага падраздзялення рэактыўнымі снарадамі. Групе разведчыкаў, у якую ўваходзіў і Алег Кітаёў, сумесна з падраздзяленнем афганскіх воінаў была пастаўлена задача – знайсці і знішчыць вандруючую ўстаноўку.

Выйшлі прыцемкамі. Баявыя машыны засталіся ўнізе. Зрабіўшы некалькі петляў, горная сцежка ўперлася ў непраходныя для тэхнікі скалы. Зброю, боепрыпасы, ваду неслі на сабе. Ежу не бралі – кожная бляшанка кансерваў у рэчмяшку займае месца гэтулькі ж, колькі два магазіны з патронамі. Патроны ў гарах больш патрэбныя.

Наперадзе ішоў афганскі праваднік, які абяцаў паказаць, дзе душманы хаваюць рэактыўную ўстаноўку і ракеты. Ледзь ланцужок разведчыкаў і афганцаў мінуў паварот цясніны – зверху і з флангаў ударылі аўтаматныя чэргі. Аднак застаць знянацку нашых воінаў не ўдалося. Яны былі

падрыхтаваныя да такой змены падзей. Нездарма праціўнік з неймавернай лютасцю абараняе гэтае месца. Напэўна, тое, што шукаюць разведчыкі, схаванае менавіта тут.

Кулі цюкалі па камянях, са свістам рыкашэцілі. Дзесьці справа загаварыў буйнакаліберны кулямёт. І тут Алега секанула каменнай крышанкай. «Разрыўнымі б'е», – здагадаўся Кітаёў.

Перабягаючы ад укрыцця да ўкрыцця, ён усё вышэй падымаўся па крутым схіле. Побач з ім трымаўся казах Разамбаеў з гранатамётам напагатове. «Гэта добра, – падумаў Алег, – у выпадку чаго кулямётчыка дастане».

Крайком вока заўважыў, што непадалёку караскаліся па камянях некалькі сартазаў. Дзесьці побач былі і астатнія. Кітаёў падрыхтаваўся ўжо зрабіць яшчэ адзін рывок, як раптам хтосьці аклікнуў яго:

– Шураві, глядзі, устаноўка!

Крычаў афганец. Алег Кітаёў па рацыі паведаміў камандзіру падраздзялення аб тым, што рэактыўная ўстаноўка знаходзіцца ўнізе паміж дзвюма вялізнымі скаламі. Праз пэўны час яна была знішчана ракетамі, якія выпусцілі «вяртушкі». За гэтую аперацыю наш зямляк быў узнагароджаны першым медалём «За баявыя заслугі». Потым заслужыў яшчэ адзін...

З гонарам выконваў Алег Кітаёў свой інтэрнацыянальны абавязак. У апошнія месяцы яму давялося памяняць воінскую спецыяльнасць. Быў паранены механік БМП-2, а замену своечасова не прыслалі. Алег прапанаваў камандзіру ўзяць пад сваю апеку баявую машыну. І зноў баі... У час суправаджэння калоны, якая дастаўляла дэхканам прадукты, савецкія воіны трапілі у душманскую засаду. Бой завязаўся не на жыццё, а на смерць. Быў паранены гранатамётчык БМП, і тут вельмі спатрэбілася асноўная воінская спецыяльнасць Алега... Вораг адступіў. А ў Кітаёва з'явілася яшчэ адна баявая ўзнагарода.

...Сёння Алег Кітаёў працуе на пілараме. Ён не пакінуў родныя мясціны, бо не ўяўляе сябе без іх. Расціць трох сыноў, якія вельмі хочуць быць падобнымі на бацьку, чалавека сумленнага, мужнага, працавітага.

**М. Мацієўскі.**

***НА ЗДЫМКУ: Алег Кітаёў з сынамі.***